

ПІЛІПКА-СЬІНОК

PILIPKA-OUR LITTLE SON

ПІЛІПКА-СЫНОК

PILIPKA-OUR LITTLE SON

Беларуская народная казка
A Belarussian Folk Tale

Мінск
«Юнацтва»
Yunatstva Publishers
1997



Жылі мужык і жонка. А дзяцей у іх не было. Жонка бядуе: няма каго ёй калыхаць, няма каго гадаваць...

Аднаго разу мужык пайшоў у лес, высек з алешыны палена, прынёс дахаты і кажа жонцы:

— На, калышы.

Палажыла жонка палена ў калыску ды давай калыхаць і ката спяваць:

Once upon a time there lived a man and his wife. Unfortunately they had no children. This upset his wife greately: she had nobody to rock in the cradle, nobody to take care of and comfort.

One day the man went to the forest, hewed down an alder log, brought it home to his wife and said:

"Here, put it into the cradle and rock it."

His wife laid the log into the cradle and began to rock it singing lullabies.



— Люлі, люлі, сынок, з белымі плячыцамі, з чорнымі вачыцамі...

Калыхала дзень, калыхала другі, на трэці бачыць: замест алешынкі ляжыць у калысцы хлопчык!

Зарадаваліся мужык і жонка, назвалі сынка Піліпкам і сталі яго гадаваць.

Падрос Піліпка і кажа бацьку:

— Зрабі мне, тата, залаты чоўнік, срэбранае вясельца — хачу рыбу лавіць.

"Sleep, my little baby, sleep, my white-shouldered, my blackeyed sonny."

She sang him to sleep one day and another and on the third day she saw lying in the cradle not the alder log but a little boy!

The man and his wife were very happy. They named their son Pilipka and began to take care of him.

Pilipka grew up and said to his father:

"Make a golden canoe and a silver oar for me, father, I want to go fishing."

The man made a golden canoe and a little



Бацька зрабіў яму залаты чоўнік, срэбранае вясельца ды выправіў на возера лавіць рыбу.

Сынок як лавіць ды лавіць — дзень ловіць і ноч ловіць... Нават і есці дахаты не ідзе: вельмі ж добра ловіцца! Маці яму сама абед насіла. Прынясе да возера і кліча:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Піліпка падплыве да берага, высыпле з чоўна рыбу, а сам з'есць піражок ды зноў на возера.

silver oar for his son and sent him to the lake to fish.

So the son fished and fished: all day and all night he fished... He didn't even go home to eat — so good was his catch! His mother herself brought his dinner to him. She would go to the lake and call:

"Pilipka, Sonny-boy, row up to the shore, eat a pastry so tasty, and you'll ask for more."

Pilipka would row up to the shore, throw the fish out of the boat, eat a pastry and go fishing again.



Пачула Баба Яга — касцяная нага, як маці кліча Піліпку, і парашыла яго са свету звесці! Узяла мяшок і качаргу, прыйшла да возера і пачала клікаць:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Піліпка падумаў, што гэта маці, і падплыў. А Баба Яга падчапіла качаргою чоўнік, выцягнула на бераг, схапіла Піліпку ды ў мяшок.

Baba-Yaga, the bone-legged witch, happened to hear how his mother called Pilipka and decided to do away with him. She took a sack and a poker, went to the lake and began to call Pilipka:

„Pilipka, Sonny-boy, row up to the bank and you'll thank for my pastry so tasty."

Pilipka thought it was his mother and rowed up to the bank. Baba-Yaga hooked the boat with the poker, hauled it up onto the bank, caught Pilipka and shoved him into the sack.

"Aha," she said, "you won't fish here any more!"



— Ага,— кажа,— больш не будзеш ты тут рыбку лавіць!

Закінула мяшок за плечы і панесла да сябе, у лясную гушчэчу.

Доўга несла, змарылася, села адпачыць ды і заснула. А Піліпка тым часам вылез з мяшка, паклаў туды цяжкіх камянёў ды зноў вярнуўся на возера.

Прачнулася Баба Яга, схапіла мяшок з камянямі і, крэкчучы, панесла дадому.

Прынесла і кажа да сваёй дачкі:

She threw the sack across her back and carried it to her house in the thick forest.

Long did she carry it, got very tired, sat down to have a rest and fell asleep.

Meanwhile Pilipka crawled out of the sack, put heavy stones into it and returned to the lake.

Baba-Yaga awoke, took up the sack full of stones, and, groaning, carried it home.

When at home she said to her daughter:

"Bake me this fisherman for dinner."

Baba-Yaga shook out the sack near the



— Спячы ты мне на абед гэтага рыбака.

Вытрусіла Баба Яга мяшок на падлогу, аж там адны камяні...

Як узлавалася Баба Яга, як закрычыць на ўсю хату:

— Я ж табе пакажу, як мяне падманваць!

Зноў пабегла на бераг возера ды давай клікаць Піліпку:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Пачуў гэта Піліпка.

stove — nothing there but stones! She got very angry and shouted so loudly that you could hear her all over the place.

"Ah! So you would play tricks on me! I'll teach you a lesson!"

She ran to the bank of the lake again and began to call Pilipka:

"Pilipka, Sonny-boy, row up to the bank and eat a pastry so tasty!"

On hearing that Pilipka said:

"No, you are not my mother, you are Baba-



— Не,— кажа,— ты не мая маці, а ведзьма Баба Яга: я цябе ведаю! У маёй мамы голас танчэйшы.

Як ні клікала Баба Яга, Піліпка не паслухаў яе.

«Добра ж,— падумала Баба Яга,— зраблю я сабе танчэйшы голас».

Пабегла яна да каваля і кажа:

— Каваль, каваль, натачы мне язык, каб танчэйшы быў.

Yaga, the witch! I know you perfectly well! My mother's voice is much thinner."

No matter how Baba-Yaga called Pilipka, he did not obey her.

"Well then," thought Baba-Yaga, "I'll make myself a thinner voice."

She ran to the blacksmith and said:

"Blacksmith, my blacksmith, sharpen my tongue. It should be very, very thin."

"All right!" the blacksmith said to her. "I'll sharpen it if you want. Put your tongue on the anvil."







— Добра,— кажа ёй каваль,— натачу. Кладзі яго на кавадла.

Палажыла Баба Яга свой доўгі язык на кавадла. Каваль узяў молат і пачаў кляпаць язык. Адкляпаў так, што ён зусім тонкі зрабіўся.

Пабегла Баба Яга да возера ды кліча тоненькім галаском:

— Піліпка-сынок, плыві пад беражок, з'еш піражок!

Пачуў Піліпка і падумаў, што гэта маці яго кліча.

Baba-Yaga put her long tongue on the anvil. The blacksmith took his hammer and began to beat the tongue. He hammered it until it became quite thin.

Baba-Yaga ran to the lake and called in a very thin voice:

"Pilipka, Sonny-boy, row to the bank, eat a pastry so tasty."

Pilipka heard her and thought it was his mother calling him. He rowed up to the bank, Baba-Yaga seized him and — into her sack she thrust him!



Падплыў да берага, а Баба Яга цап яго ды ў мяшок!

— Цяпер ты мяне не падманеш! — радуецца Баба Яга.

І, не адпачываючы, прынесла яго дадому. Выкінула з мяшка і кажа дачцэ:

— Вось ён — падманшчык! Палі ў печы, пячы яго. Каб да абеду гатовы быў.

Сказала яна так, а сама пайшла некуды.

Дачка запаліла ў печы, прынесла лапату і кажа Піліпку:

"Now you won't fool me any more!" Baba-Yaga rejoiced...

And without a moment's rest she brought him home, threw him out of the sack and said to her daughter:

"Here he is, the trickster! Heat the stove and bake him. To be ready by dinner-time!"

After these words, she herself went off somewhere.

Her daughter made the stove, brought the wooden shovel and said to Pilipka:



— Лажыся на лапату, я цябе ў печ саджаць буду.

Лёг Піліпка і падняў ногі ўгору.

— Не так! — крычыць ведзьміна дачка.— Гэтак я цябе ў печ не ўсаджу.

— А як жа? — пытаецца Піліпка.— Пакажы сама.

— Дурны ты! — вылаяла яго ведзьміна дачка.— Вось як трэба. Глядзі.

Лягла яна сама на лапату, выпрасталася.

"Lie down on the shovel, I'll seat you into the stove."

Pilipka lay down and held his knees up high.

"Not like that!" Baba-Yaga's daughter barked at him. "This is how you must do it! Look!"

She lay down on the shovel and stretched herself out on it.

Pilipka grabbed the shovel and into the stove with it! And he shut her in with the oven door. Then he put the witch's heavy mortar against it she should not be able to jump out from the stove.



А Піліпка за лапату ды ў печ. І заслонкаю яе засланіў ды яшчэ моцна ведзьмінаю ступаю затуліў, каб не выскачыла з гарачай печы.

Толькі ён выбег з хаты, бачыць: Баба Яга ідзе.

Піліпка скокнуў на высокі густы явар і схаваўся ў галлі.

Зайшла Баба Яга ў хату, панюхала — смажаным пахне. Дастала з печы смажаніну, наелася мяса, косці на двор выкінула ды пачала качацца на іх, прымаўляючы:

Hardly had he run out of the hut, than he saw Baba-Yaga returning back. Pilipka climbed up a tall thick maple-tree and hid himself among the branches. Baba-Yaga came into the hut, sniffed — it smelled of roasted meat! She took out the roasted meat from the oven, ate her full of the meat, and the bones she threw out into the yard and began to roll on them, stamping on them, saying slyly:

"I'll fall and roll, of Pilipka's meat my full I've eaten, of his blood my full I've drunk."



— Павалюся, пакачуся, Піліпкавага мяса наеўшыся, крыві напіўшыся.

А Піліпка адказвае ёй з явара:

— Паваліся, пакаціся, доччынага мяса наеўшыся, доччынай крыві напіўшыся.

Пачула гэта ведзьма і аж учарнела ад злості. Падбегла да явара і давай яго зубамі падгрызаць.

Грызла, грызла, зубы паламала, а моцны явар стаіць, як стаяў.

And Pilipka answered Baba-Yaga from the maple:

"Fall down and roll, and of your daughter's meat you have eaten your full, and of your daughter's blood you have drunk your full."

On hearing this the witch even turned black with fury. She ran over to the maple and began to gnaw it with her teeth. She gnawed and gnawed, broke her teeth, but the mighty maple stands as it stood.

Baba-Yaga then ran to the blacksmith.

"Blacksmith, oh, blacksmith, forge me a steel axe, otherwise I'll eat up your children."





Пабегла тады Баба Яга да каваля:

— Каваль, каваль, выкуй мне сталёвую сякеру, а то я тваіх дзяцей паем.

Спужаўся каваль, выкаваў ёй сякеру.

Прыбегла Баба Яга да явара, пачала яго секчы. А Піліпка кажа:

— Не ў явар, а ў камень!

А ведзьма сваё:

— Не ў камень, а ў явар!

А Піліпка сваё:

— Не ў явар, а ў камень!

The blacksmith was frightened and he made an axe for her.

Baba-Yaga ran back to the maple and began to cut it down.

Pilipka said:

"Beat not the maple but the stone!"

But the witch goes on cutting the tree down: "Not the stone but the maple!"

Pilipka still says:

"Not the maple but the stone."

Here the axe strikes the stone so hard that it breaks. The witch groans with fury, grabs the axe



Тут сякера як стукнецца ў камень — уся вышчарбілася.

Заенчыла са злосці ведзьма, схапіла сякеру ды пабегла да каваля вастрыць.

Бачыць Піліпка — хістацца пачаў ужо явар: падсекла яго ведзьма! Трэба ратавацца, пакуль не позна.

Ляціць чарада гусей. Піліпка да іх:

— Гусі, гусі, скіньце мне па пяру! Я з вамі

and runs to the blacksmith to sharpen it.

Pilipka sees the maple is beginning to sway already. The witch had almost cut it down!.. It is necessary to save himself bofore it is too late.

A flock of geese comes flying. Pilipka says to them:

"Geese, dear geese, throw me down, each one of you, a feather. I'll fly together with you to my father and mother, there I'll repay you..."

The geese threw down to him each one a feather. Pilipka made from these feathers half a wing only.





палячу да бацькі, да маткі, там вам адплачу...

Гусі скінулі яму па пяру.

Зрабіў Піліпка з гэтых пёраў толькі паўкрыла.

Ляціць другая чарада гусей. Піліпка просіць:

— Гусі, гусі, скіньце мне па пяру! Я з вамі палячу да бацькі, да маткі, там вам адплачу...

І другая чарада скінула яму па пяру.

Another flock of geese comes flying. Pilipka asks:

"Geese, dear geese, throw me down, each one of you, a feather. I'll fly together with you to my father and mother, there I'll repay you..."

And this second flock of geese threw down to Pilipka each one a feather. Then there came flying a third and a fourth flock. And all the geese threw down to him each one a feather.

Pilipka made himself wings and flew after the geese.





Потым праляцелі трэцяя і чацвёртая. І ўсе гусі скінулі Піліпку па пяру.

Зрабіў сабе Піліпка крылы ды паляцеў услед за гусямі.

Прыбегла ведзьма ад каваля, сячэ явар, аж трэскі сыплюцца.

Секла, секла — явар — трах! — упаў на ведзьму і задушыў яе.

А Піліпка прыляцеў з гусямі дахаты. Зараваліся бацькі, што Піліпка вярнуўся, пасадзілі яго за стол, пачалі частаваць.

А гусям далі аўса. Тут і казка ўся.

Baba-Yaga came running from the blacksmith's and struck at the maple so that chips fell.

She struck and struck — the maple cracked! — fell down on the witch and killed her.

And Pilipka flew with the geese to his hut. His parents were so happy that Pilipka had returned, they seated him at the table, gave him delicious things to eat.

And they gave oats to the geese.

So this story has come to the end.



Литературно-художественное издание

ПИЛИПКА-СЫНОК

Белорусская народная сказка

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском и английском языках

Рэдактар *В. Я. Ціхановіч*

Мастак *В. П. Славук*

Мастацкі рэдактар *В. А. Макаранка*

Тэхнічны рэдактар *А. В. Русецкая*

PILIPKA — OUR LITTLE SON

A Belarussian Folk Tale

Minsk, Yunatstva Publishers, 1997

Здадзена ў набор 17.05.93. Падпісана да друку 27.02.96. Фармат 70×90$^{1}/_{8}$. Папера афсетная. Гарнітура Літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 4,68. Ум. фарб.-адб. 19,89. Ул.-выд. арк. 3,95. Тыраж 6000 экз. Зак. 620.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

П $\frac{8820600000—020}{\text{М 307(05)—97}}$

ISBN 985-05-0011-9

© Ілюстрацыі. Выдавецтва «Юнацтва», 1983.

© Translation into English, Yunatstva Publishers, 1989.

26100 z